**УДК 392.1(476) «19/20»**

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І ЛАКАЛЬНЫЯ ВАРЫЯНТЫ[1]

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*На аснове этнаграфічных матэрыялаў другой паловы XIX – пачатку XXI ст. разгледжана традыцыйная пахавальная абраднасць беларусаў Падзвіння. Вылучаны рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты. Прыходзім да высновы, што традыцыйныя пахавальныя абрады беларусаў Падзвіння ў сваёй аснове маюць тыя ж кампаненты, што і абраднасць іншых рэгіёнаў краіны, але пры гэтым праяўляюць рэгіянальныя асаблівасці. У межах рэгіёна пахавальная абраднасць беларускага этнасу мае лакальную варыятыўнасць. Яна характэрна асобным абрадавым дзеянням, іх семантыцы, уяўленням і прадпісанням, матэрыяльнай абрадавай атрыбутыцы, а таксама праяўляюцца ў наяўнасці ці адсутнасці ў канкрэтным рэгіёне пэўных структурных частак абраду. Да этналагічнага вывучэння былі прыцягнуты новыя матэрыялы, значная частка якіх зафіксавана аўтарам у межах рэгіёна.*

***Ключавыя словы****: традыцыйная пахавальная абраднасць, Падзвінне, беларускі этнас.*

**Уводзіны.** У традыцыйнай культуры асобае месца займаюць абрады, якія ў найбольшай ступені адлюстроўваюць асаблівасці этнічных супольнасцей. Вывучэнне абраднасці беларускага этнасу дазваляе выявіць спецыфічныя рысы яго этнічнай культуры ў прасторы і часе. У сваю чаргу, даследаванне пытанняў генезісу і эвалюцыі асобных абрадавых комплексаў дае магчымасць прасачыць тэндэнцыі развіцця этнічных супольнасцей. Выключнае месца сярод усіх абрадаў займаюць пахавальна-памінальныя, якія вылучаюцца высокай ступенню кансерватыўнасці і ўстойлівасці. Па гэтай прычыне яны з'яўляюцца надзвычай інфармацыйнай (а таму вельмі важнай і каштоўнай) крыніцай для вывучэння і рэканструкцыі этнічных працэсаў у цэлым. З іншага боку, пахавальная абраднасць дазваляе выявіць узаемасувязі абрадавых комплексаў сямейнага і каляндарнага цыклаў на розных этапах развіцця этнасу. А таму даследаванне пахавальнай абраднасці садзейнічае лепшаму разуменню іншых праяў самабытнай духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

Пахавальная абраднасць беларусаў не з'яўляецца аднароднай на ўсёй тэрыторыі краіны. У розных рэгіёнах гэта частка культуры мае свае асаблівасці, што робіць актуальным правядзенне спецыяльных арэальных этналагічных даследаванняў. У першую чаргу неабходна асэнсаваць этнакультурныя асаблівасці буйных гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, да якіх адносіцца Беларускае Падзвінне.

Кожная лакальная традыцыя фарміруецца пад уздзеяннем шэрагу фактараў: прыродна-геаграфічных, гістарычных, дзяржаўна-палітычных, сацыяльна-эканамічных і інш. Немалаважную ролю сярод іх адыгрываюць уласна этнічныя працэсы. Вывучэнне лакальных комплексаў культуры дазваляе лепш зразумець асаблівасці этнічнай гісторыі ў канкрэтным рэгіёне. Улічваючы кансерватыўнасць пахавальнай абраднасці, яна стварае выдатную магчымасць для рэканструкцыі традыцыйнай карціны свету беларусаў у кантэксце іх этнакультурнага развіцця.

**Крыніцамі** даследавання сталі пераважна этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы XIX – пачатку XX ст. Выкарыстаны матэрыялы, змешчаныя ў этнаграфічных зборніках і працах М. Анімеле, М.Я. Нікіфароўскага, А.Р. Пшчолкі, А. Троіцкага, А. Шлюбскага, П.М. Шпілеўскага, П.В. Шэйна, а таксама матэрыялы, сабраныя пазней, нават на пачатку XXI ст. Гэта абумоўлена той акалічнасцю, што матэрыялы, зафіксаваныя XIX – пачатку XX ст. (якія характарызуюць яшчэ традыцыйны стан пахавальнай абраднасці), не даюць поўнага ўяўлення аб усіх яе асаблівасцях з-за сваёй фрагментарнасці і недастатковай колькасці. Таму, характарызуючы гэты сегмент духоўнай культуры беларусаў Падзвіння, лічым мэтазгодным выкарыстанне матэрыялаў, якія адносяцца да больш позніх перыядаў. Гэта тым больш актуальна, калі гаворка ідзе пра рэканструкцыю агульнай структуры пахавальнага абраду, а таксама вылучэнне рэгіянальных асаблівасцей і лакальных варыянтаў у межах Падзвіння. У даследаванні выкарыстаны матэрыялы Архіва гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (АГФФ), Архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (АІМЭФ), матэрыялы рукапіснага фонду літоўскага фальклора Інстытута літоўскай літаратуры і фальклора (РФЛФ), апублікаваныя этнаграфічныя матэ-

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РДНФ (ПР) «Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI в.: уровни репрезентации и динамика кросскультурных связей» (дамова № Г16РП-004).

рыялы. Асноўнае месца ў працы займаюць матэрыялы ўласных палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара ў рэгіёне.

**Асноўная частка.** Інварыянтам традыцыйнага пахавальнага абраду беларусаў Падзвіння з'яўляецца пахаванне людзей сталага ўзросту, якія памерлі «сваёй» смерцю («ад старасці»). Такая абумоўленасць тлумачыцца сувяззю ў традыцыйнай свядомасці паняцця «век» (працягласць жыцця чалавека) з яго доляй, якая яму нібыта даецца пры нараджэнні. У традыцыйным грамадстве век як тэрмін чалавечага жыцця (які не мае дакладнага колькаснага вымярэння) – час напоўнены, блізкі да долі, час выдаткоўвання першапачаткова закладзенай жыццёвай патэнцыі [1, с. 40]. У народнай свядомасці беларусаў гэта можа быць выражана наступным чынам: *«Ну, чаму ён памірае, хлеб увесь свой з'еў»* (в. Свіркі Докшыцкага раёна) [2, арк. 4]. Таму натуральная смерць чалавека надыходзіць, калі той вычарпаў сваю жыццёвую сілу, патраціў яе на працягу ўсяго жыцця. Аднак такі варыянт з'яўляецца ідэальным. Схема прадугледжвае адхіленне як у бок заўчаснай, так і ў бок прыпозненай смерці («недажытага» і «переажытага» веку) [3, с. 102].

Уяўленне аб «пераажытым» веку больш характэрна для паўднёвых славян. У некаторых раёнах Сербіі і Балгарыі па старых, якія «зажыліся», нават спраўлялі пры жыцці памінкі, каб такім чынам пры дапамозе рытуалу абмежаваць працягласць іх «веку» [3, с. 102]. Ва ўсходнеславянскай традыцыі такія ўяўленні не маюць шырокага распаўсюджання. Існуюць некаторыя асаблівасці адзення і транспарту на пахаванні старых, а таксама паданні, як некалі старыкоў забівалі («саджалі на лубок») [1, с. 41]. Падобныя ўяўленні характэрны і для беларускага традыцыйнага эпасу [4, с. 104–108]. Больш пашыраны на ўсходнеславянскай тэрыторыі ўяўленні аб заўчасна памерлых і памерлых «не сваёй» смерцю [5, с. 39–40].

Памерлыя «сваёй» смерцю пераходзілі ў катэгорыю «дзядоў». Да іх адносіліся з глыбокай пашанай і рэгулярна паміналі. Заўчасна памерлыя характарызаваліся як «нячыстыя» нябожчыкі. Яны пазбаўляліся гэтай пашаны (а таму і памінання) і лічыліся нават небяспечнымі для жывых. Згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў заўчасная смерць пакідала нябожчыку не страчаную ў зямным жыцці энергію, якую ён мусіў траціць пасля смерці, але ўжо на шкоду людзям [6, с. 449]. Архаічныя вераванні аб «сваёй» / «не сваёй» смерці зведалі значныя змены пад уплывам хрысціянства. Да «нячыстых» нябожчыкаў сталі адносіцца толькі нехрышчоныя дзеці і самагубцы. Сляды архаічных уяўленняў аб «недажытым» веку яшчэ да нашага часу захоўваюцца ў своеасаблівым характары пахавання моладзі [1, с. 46–47, с. 76–77; 7, с. 318]. Да катэгорыі «нячыстых» нябожчыкаў далучаюцца таксама памерлыя, якія пры жыцці лічыліся чараўнікамі [7, с. 321]. Каб прадухіліць магчымую шкоду «небяспечных» нябожчыкаў, пры іх пахаванні існавалі спецыяльныя прыёмы, а таксама больш строга сачылі за выкананнем усіх абрадавых дзеянняў [7, с. 318–322].

Смерць чалавека «ад старасці» ў традыцыйным беларускім грамадстве разглядалася як натуральная з'ява. Час яе наступлення, як лічылася, прадказваюць разнастайныя прыкметы. У прыкметах «на смерць» беларусаў Падзвіння прасочваецца агульнабеларускія рысы і мала лакальных асаблівасцей. Аднак сярод іх вылучаюцца некаторыя даволі спецыфічныя прыкметы, якія былі зафіксаваны на Падзвінні. Так, па меркаванні беларускага насельніцтва Падзвіння, смерць здарыцца, калі чорная карова стане глядзець праз вакно ў хату, калі свіння вырые яму сярод дарогі перад чыёй-небудзь хатай і будзе ляжаць галавой у бок могілак, калі котка любіць ляжаць на стале ці куце, калі дзяцел пачне дзяўбсці сцяну хаты, калі ўвесь дзень «пчолы пералятаюць вясковую "вулку"» [8, с. 150, с. 158, с. 164, с. 195, с. 203].

Традыцыйны пахавальны абрад беларусаў Падзвіння ўключаў рытуальныя дзеянні, якія пачыналіся яшчэ да смерці чалавека. У выпадку «цяжкай» смерці з мэтай аблегчыць перадсмяротную агонію паміраючага выконвалі шэраг сімвалічных дзеянняў. Такога чалавека клалі на падлогу, падсцілаючы пад яго кажух, адчынялі дзверы і вокны [8, с. 282; 9, с. 14; 10, с. 141]. Праваслаўныя беларусы рэгіёна, заўважыўшы набліжэнне смерці, хвораму апраналі чыстую бялізну і пераносілі яго з ложка на лаву, клалі галавой да абразоў і запальвалі свечку [11, с. 209]. У момант надыходу смерці ў наш час яшчэ пашырана традыцыя даваць у рукі паміраючаму свечку [12, арк. 18, арк. 55; 13, арк. 29; 2, арк. 18; 14, арк. 4]. Гэта традыцыя звязана з уяўленнямі аб цемры «таго» свету, куды перамяшчаецца памерлы [3, с. 104–105; 15, с. 83]. Такое меркаванне пацвярджаюць матэрыялы сучасных палявых даследаванняў на Падзвінні [13, арк. 8; 2, арк. 15].

Адразу пасля смерці чалавека існаваў строга рэгламентаваны парадак рытуальных дзеянняў. Пасля таго як памерлы «адышоў», хтосьці з родных тушыў свечку, браў яе з рук памерлага і праводзіў накрыж у паветры [8, с. 285]. У в. Забор'е Расонскага раёна існавала крыху іншая традыцыя. Пасля смерці кругом памерлага абносілі тры разы свечку і давалі яе *«пад нос панюхаць»* [16, арк. 29]. Падобная традыцыя зафіксавана і ў Глыбоцкім раёне (вв. Шо, Вострава) [17, арк. 22, арк. 45]. Пасля гэтага памерламу закрывалі рот, вочы, абкурвалі яго свянцонымі зёлкамі [18, с. 378]. Патрабаванне закрываць памерламу вочы пасля смерці, згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў Падзвіння, тлумачылася перасцярогай, каб нябожчык не «выглядзеў» каго з жывых і не «забраў» іх з сабой (каб пазбегнуць новай смерці) [8, с. 286]. Для большай упэўненасці, або калі вочы не закрываліся, на іх клалі манеты ці вугалі [19, арк. 39; 20,

арк. 37; 2, арк. 5].

Наступным абрадавым дзеяннем было абмыванне памерлага, значэнне якога на сімвалічным узроўні куды большае, чым проста ачышчэнне. Яно было найперш скіравана на ліквідацыю прыкмет і якасцей, уласцівых жывым людзям [3, с. 107]. У абрадавых дзеяннях беларусаў, якія суправаджаюць абмыванне цела нябожчыка, існуюць лакальныя адрозненні [9, с. 23]. Як вынікае з этнаграфічных крыніц, існаванне лакальных варыянтаў характэрна і ў межах Падзвіння. Яны тычацца часу выканання дадзенай часткі абраду. На Падзвінні цела нябожчыка пачыналі абмываць адразу пасля смерці [21, с. 518] або праз пэўны час (адну-дзве гадзіны) [22, с. 316; 16, арк. 17]. Згодна з традыцыяй на Падзвінні цела памерлага мужчыны павінны абмываць і апранаць мужчыны, а жанчыны – жанчыны [8, с. 285; 23, с. 95]. У паўночна-ўсходняй частцы Беларусі гэтымі працэдурамі, незалежна ад полу памерлага, у мінулым займаліся старыя жанчыны – «мерцвячыхі», якія і даглядалі за хворым у апошнія хвіліны яго жыцця [10, с. 141].

Пасля абмывання памерлага тыя рэчы, якія выкарыстоўваліся, звычайна знішчалі. Іх прымянялі ў лекаванні, шкаданоснай магіі. Асабліва гэта тычылася вады, якой мылі памерлага. Лічылася, што вада ад мыцця нябожчыка мае адмоўную, разбуральную моц (як «мёртвая» вада), а таму магла нашкодзіць людзям і гаспадарцы [24, арк. 86]. У межах рэгіёна існуе варыятыўнасць адносна месца, куды было прынята выліваць гэту ваду. Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца спосаб выдаляць ваду ў локусы з агульнай характарыстыкай «дзе ніхто не ходзіць і нішто не расце» або «дзе сонца не свеціць» (на сметнік, пад плот і інш.) [19, арк. 21, арк. 38; 12, арк. 56; 13, арк. 55; 25, арк. 22]. Менш пашыраным на Падзвінні з'яўляецца варыянт вылівання вады на сцяну ці вугал хаты (звычайна на кутні вугал) [26, арк. 12; 27, арк. 10]. У рэгіёне сустракаецца таксама спосаб выдалення «мёртвай» вады на дарогу ці скрыжаванне дарог [28, арк. 23; 26, арк. 29]. Нягледзячы на існаванне варыятыўнасці ў дадзенай частцы абраду, усе гэтыя локусы сімвалічна звязаныя паміж сабой і апелююць да ідэі камунікацыі з тагасветам, куды і мусіць быць выдалена «мёртвая» вада. Прыведзеныя варыянты знішчэння вады, якой мылі нябожчыка, у рэгіёне не заўсёды абумоўлены тэрытарыяльна і ў адной лакальнай традыцыі іншы раз існуюць разам [26, арк. 12, арк. 29].

Важным этапам у сістэме пахавальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляецца выраб труны. Гэта пацвярджаецца існаваннем на дадзеным этапе абраду шэрагу строгіх рэгламентацый і прадпісанняў. Згодна з патрабаваннем, якое існавала ў Віцебскім павеце, труну трэба было рабіць на дварэ памерлага. Яе рабілі з адной калоды. Цвікі павінны быць драўлянымі, а дошкі сваімі, не падоранымі ці пазычанымі [8, с. 287]. Дно труны звычайна засцілалі трэскамі і габлюшкамі, якія заставаліся пасля яе вырабу [12, арк. 56; 2, арк. 6; 21, с. 513]. У Дрысенскім павеце існаваў звычай спальваць астаткі ад труны ў маладаступным месцы або пускаць іх у праточную ваду [8, с. 287–288]. Традыцыя спальваць трэскі, якія засталіся пасля вырабу труны, зафіксавана таксама ў вёсках Хралы і Рускі Завулак Глыбоцкага раёна [19, арк. 38; 29, арк. 37]. Для гэтай часткі абраду характэрны і іншыя лакальныя адрозненні. Так, у Віцебскім павеце дамавіну іншы раз рыхтавалі загадзя, яшчэ пры жыцці чалавека [21, с. 510]. У той жа час у Люцынскім павеце Віцебскай губерні лічылася вялікім грахом, калі пры жыцці чалавека, нават цяжка хворага, рабілі труну [21, с. 529]. Пачатак вырабу труны іншы раз залежаў ад лакальнай традыцыі. У Віцебскім павеце яе пачыналі рабіць з «палажэннем цела на кут» [8, с. 287], а на Верхнядзвіншчыне труну рабілі на другі дзень пасля смерці [22, с. 317]. Лакальная варыятыўнасць характэрна і для назвы труны. У паўночна-ўсходняй частцы Падзвіння больш пашырана назва *«гроб»*, на астатняй частцы рэгіёна – назвы *«дамаўё»*, *«труна»* і *«дамавіна»* [30, с. 103–104].

Дамавіна пасля падрыхтоўкі перамяшчалася ў хату. У яе пераносілі памерлага. Труну ставілі на тое месца, дзе да гэтага ляжаў нябожчык. У сучасны перыяд больш пашырана традыцыя класці памерлага ў труну адразу, як яна падрыхтавана [2, арк. 6, арк. 14, арк. 16; 31, л. 157]. У Віцебскім павеце памерлага пераносілі ў труну непасрэдна перад вынасам яго на могілкі [21, с. 513]. Лакальная варыятыўнасць у гэтай частцы абраду звязана з месцам свечкі, якую запальвалі каля памерлага. Яе размяшчалі каля абразоў [32, с. 9; 11, с. 209], у галаве памерлага [33, с. 70], на стале [16, арк. 29] або вакне [34, арк. 45].

У адпаведнасці з традыцыяй пахаванне памерлага на Падзвінні адбывалася на другі ці трэці дзень пасля смерці [264, с. 513]. У розных частках рэгіёна існуе лакальная варыятыўнасць, звязаная з часам пахавання памерлага. На смаленска-беларускім памежжы больш распаўсюджана традыцыя пахавання на другі дзень пасля смерці, а на пскоўска-беларускім – на трэці [31, л. 164]. На Докшыччыне існавала традыцыя хаваць памерлага нават у дзень смерці. Такі час пахавання быў для жыхароў в. Гняздзілава традыцыйным і адпавядаў іх «укладу» [33, с. 69]. У наш час такая традыцыя знікла. Пахаванне памерлага, незалежна ў які дзень яно адбывалася, традыцыйна ладзілі на Падзвінні ў другой палове дня [19, арк. 39; 13, арк. 30, арк. 55; 16, арк. 17].

Лакальная варыятыўнасць характэрна і для рытуальных дзеянняў у час вынасу цела памерлага з хаты для пахавання. У в. Забор'е Расонскага раёна існавала традыцыя праходзіць усім дзецям па старшынству пад труной на вуліцу пры вынасе яе з хаты [35, с. 199]. Падобныя абрадавыя дзеянні распаў-

сюджаны таксама ў Вялікалукскім і Себежскім раёнах Пскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі [31, л. 172]. У в. Грышына Расонскага раёна калі выносілі труну, то абарочвалі табурэткі і лаву. Дзеці ў гэты час станавіліся на калені і прасілі прабачэння ў памерлага [35, с. 199]. На Верхнядзвіншчыне існавала падобная традыцыя. Тут табурэткі выносілі на двор і перакульвалі, ставілі дагары, каб больш у гэтай хаце не было памерлых [22, с. 317]. У Себежскім павеце Віцебскай губерні, калі памерлы быў галавой сям'і, то пры вынасе яго з хаты ўся сям'я і знаёмыя, якія паважалі яго, кланяліся да зямлі і заставаліся ў такім становішчы да таго часу, пакуль яго не вынесуць за вароты [36, с. 89].

У Дрысенскім павеце як толькі падымалі труну для вынасу, на тое месца клалі хлеб, соль і пасыпалі яравым збожжам, а са стала знімалі абрус [8, с. 288]. Традыцыя абсыпаць труну зернем у момант вынасу з хаты распаўсюджана на Падзвінні, як і ў іншых частках Беларусі [37, с. 274; 38, с. 310; 39, с. 403; 40, с. 560–561]. У Себежскім павеце і другіх блізка размешчаных да яго мясцовасцях «абсявалі» збожжам святара, калі той праходзіў праз вароты, каб больш ніхто ў гэтым доме не паміраў [41, с. 373]. Як вынікае з матэрыялаў сучасных палявых даследаванняў, абсыпанне збожжам труны ў час яе вынасу мае полісемантычны характар: з аднаго боку, нябожчыку сімвалічным чынам вылучалася яго частка прыжыццёвай долі, з другога – абрадавае дзеянне мусіла спрыяць захаванню долі жывых сваякоў [42, с. 90–91]. Нягледзячы на адносна позні перыяд бытавання такіх павер'яў, іх нельга лічыць навацыямі сучаснага перыяду або трансфармацыяй больш ранніх уяўленняў. Яны стасуюцца з архаічнымі вераваннямі славян пра смерць чалавека і яго долю [1, с. 43–45].

Пасля вынасу труны ў некаторых частках Падзвіння існавала прадпісанне прыбраць у хаце (падмесці ці памыць падлогу) [13, арк. 18; 2, арк. 7; 18, с. 384]. У шэрагу месцаў Падзвіння, наадварот, прыбіраць у хаце ў гэты момант катэгарычна забаранялася. У Дрысенскім павеце існавала строгая забарона мясці хату ў час вынасу памерлага. Яна тлумачыцца тым, каб памерлы не панёс з сабой сямейных сварак на той свет [8, с. 288]. Забарона на прыбіранне ў хаце ў момант вынасу нябожчыка сустракаецца ў рэгіёне і ў наш час, але іншы раз мае другое тлумачэнне: *«Нельга вымітаць за нябожчыкам, бо ўсё добрае выміціш за ім»* (в. Бабруйшчына Глыбоцкага раёна) [43, арк. 14]. У в. Кашталянаўшчына Глыбоцкага раёна бытуе павер'е, што прыбіраць у хаце трэба на наступны дзень пасля пахавання: *«Патом, на другі дзень посля памінак, нада ўсё памыць у хаці, кап пакойніку на тым свеці было лёхка і чыста»* [44, с. 281]. Такая варыятыўнасць у абрадавых дзеяннях тлумачыцца амбівалентнасцю смецця ў беларускай традыцыйнай культуры. З аднаго боку смецце выступае як нешта «аджыўшае» і, такім чынам, звязанае з ідэяй смерці. Таму патрэбна выдаліць яго з хаты разам з памерлым. З іншага боку смецце разумеецца як неад'емны вынік жыццядзейнасці людзей, а таму генетычна звязана з ідэяй жыцця. Забарона падмятаць хату і выкідваць смецце звязана і з увасабленнем у смецці нейкай долі жывых насельнікаў хаты, каб «не вынесці яшчэ аднаго нябожчыка ўслед за першым» [45, с. 451].

На Падзвінні традыцыйным транспартам, на якім адвозілі памерлага на могілкі былі зімой сані, а летам – воз, у якія запрагалі каня. Паўсюдна ў рэгіёне конь, на якім везлі нябожчыка на могілкі, асабліва шанаваўся. Яго вялі не за павады, якія спецыяльна адвязвалі, а за ручнік ці пояс. У Себежскім павеце на мяжы з Рэжыцкім гэтаму каню кланяліся да зямлі. А ў Станіслаўскай воласці Лепельскага павета гаспадар цалаваў капыты як запрэжанаму каню, так і іншым сваім коням [21, с. 521–522].

На Падзвінні існавала традыцыя накрываць пастаўленую на воз труну кавалкам новага матэрыялу, які называўся «пагробшчына», часам адзеннем. Гэта «пагробшчына» ішла на карысць царквы (Віцебскі і Лепельскі паветы) [8, с. 289; 32, с. 48]. У в. Гняздзілава (сучасны Докшыцкі раён) на труну садзілася адна са сваячаніц памерлага і ўсю дарогу да могілак галасіла па ім [46, с. 95–96]. У наш час такія традыцыі не бытуюць на Падзвінні.

Важным этапам пахавальнага абраду з'яўляецца адпраўка памерлага на могілкі. Паводзіны людзей у час руху працэсіі строга рэгламентаваныя. У першую чаргу рэгламентавалася пахавальнае шэсце. У Віцебскім павеце (Велішковіцкая воласць) быў наступны парадак пахавальнай працэсіі: наперадзе ішоў нехта з крыжам і званком, затым неслі царкоўную харугву, за ёй труну, а потым ішлі ўсе астатнія. Калі прысутнічаў святар, то ён ехаў на кані наперадзе працэсіі [21, с. 515]. Падобная схема пахавальнай працэсіі з пэўнымі лакальнымі варыяцыямі з'яўляецца распаўсюджанай на Падзвінні: *«Вянкі, крышку, патом гроб, а патом ідуць свае родственнікі, самыя блізкія. А ззаду ўсе астатнія»* (в. Сакалішча Расонскага раёна) [34, арк. 15]. У той жа час на Шаркаўшчыне (в. Германавічы) сярод каталіцкага насельніцтва існаваў іншы парадак – наперадзе павінна ісці дзіця, якое нясе крыж, потым ксёндз, за ім «пеўшыя», тыя, хто нясе вянкі, потым памерлы, а за ім усе родныя, блізкія і госці [18, с. 384]. У заходніх раёнах Падзвіння крыж іншы раз несла жанчына, якая не жыве з мужам (удава, або тая, якая не была замужам) [18, с. 384]. У паўночна-ўсходняй частцы Вілейскага раёна наперадзе пахавальнай працэсіі ішоў мужчына з крыжам [47, s. 451].

Згодна з традыцыяй праводзіць памерлага на могілкі павінны ўсе жыхары вёскі. У Віцебскім павеце існавала патрабаванне ўсім вяскоўцам, нават тым, хто не ўдзельнічаў у пахаванні, у гэты час

выходзіць з хат і, стоячы ў варотах, хрысціцца [41, с. 370]. У в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна ў час руху пахавальнай працэсіі па вёсцы неабходна было таксама выйсці на вуліцу ці глядзець у вакно [18, с. 384]. У той жа час у в. Лісна Полацкага раёна глядзець у вакно ў той момант, калі вязуць па вёсцы нябожчыка, катэгарычна забаранялася [48, арк. 26].

Падрыхтоўка магілы традыцыйна адбываецца ў дзень пахавання. Гэтай справай займаюцца 3–4 мужчыны (*«капачы», «капаўшчыкі», «капальшчыкі»*), але не родныя нябожчыка [19, арк. 21, арк. 40; 13, арк. 35; 14, арк. 6; 26, арк. 14].

Па прыбыцці на могілкі труну здымалі з воза і ставілі каля выкапанай магілы. Тут адбывалася развітанне з памерлым, пасля чаго труну закрывалі векам і закопвалі. У рэгіёне паўсюдна зафіксавана традыцыя перад закопваннем кідаць у магілу грошы [19, арк. 41; 49, арк. 23]. У шэрагу населеных пунктаў Падзвіння такі варыянт абрадавых дзеянняў выконваўся толькі ў тым выпадку, калі пры капанні магілы былі знойдзены астанкі раней пахаванага чалавека [19, арк. 41; 34, арк. 12]. У в. Свіркі Докшыцкага раёна такая традыцыя была характэрна толькі тады, калі ў маці часта паміралі дзеці: *«Гэта плаціла зямельцы, каб не забірала дзяцей»* [2, арк. 8, арк. 12]. Як вынікае з этнаграфічных крыніц, у беларусаў Падзвіння кінутыя ў магілу грошы сімвалізавалі плату за месца (ахвяру зямлі ці тым, хто раней пахаваны), а таксама надзяленне доляй памерлага з тым, каб апошні спрыяў жывым нашчадкам (каб грошы не пераводзіліся ў хаце).

На магіле памерлага ўстанаўліваўся драўляны крыж. Пасля некаторага часу (часцей праз год пасля смерці) яго замянялі больш трывалым надмагіллем. Традыцыйныя надмагіллі беларусаў Падзвіння яскрава дэманструюць рэгіянальныя асаблівасці. На Падзвінні кананічныя драўляныя крыжы, пашыраныя ў іншых рэгіёнах краіны, не былі галоўнымі ў арганізацыі прасторы могілак. Асноўнымі тут былі каменныя надмагіллі (у выглядзе адзіночных камянёў, магіл з абкладкай, каменных крыжоў, жальнікаў). Яны выразна адрозніваліся сваёй формай і памерамі ад каменных надмагілляў іншых рэгіёнаў краіны [50, арк. 67; 51, арк. 2; 52, с. 60, с. 93].

Важнай часткай пахавальнага абраду з'яўляецца памінальнае застолле, якое ладзілі ў хаце памерлага ў дзень пахавання. Этнаграфічныя крыніцы разыходзяцца ў вызначэнні часу яе правядзення. У некаторых частках Падзвіння памінальнае застолле ладзілі яшчэ да пахавання. Яно адбывалася непасрэдна перад вынасам цела з дому. Такая традыцыя была характэрна для Себежскага і Віцебскага паветаў [8, с. 288; 36, с. 89; 21, с. 513, с. 520]. Матэрыялы з Лепельшчыны і Докшыччыны апісваюць іншую традыцыю. Памінальнае застолле адбывалася тут пасля пахавання [32, с. 52; 46, с. 96; 41, с. 373]. Прыведзеныя два варыянты парадку абрадавых дзеянняў указваюць на лакальныя адрозненні ў дадзенай частцы пахавальнага абраду: на паўночным усходзе рэгіёна памінальная трапеза ладзілася да пахавання, у цэнтральнай і заходняй частках – пасля яго. У сучасны перыяд ва ўсім рэгіёне памінальная трапеза адбываецца пераважна пасля пахавання. Разам з тым у Віцебскім павеце суіснавалі дзве традыцыі. Калі могілкі знаходзіліся блізка ад вёскі, то жалобны стол адбываўся пасля пахавання [21, с. 513, с. 520].

У рэгіёне існуюць і іншыя лакальныя адрозненні, якія тычацца памінальнага застолля. Яны праяўляюцца ў асаблівасцях пасадкі прысутных за памінальны стол. У рэгіёне распаўсюджана традыцыя саджаць на самае пачэснае месца («на кут») тых людзей, якія дапамагалі ў пахаванні, асабліва хто капаў яму, мыў і апранаў памерлага, спяваў і чытаў над ім [25, арк. 10; 26, арк. 27, арк. 32]. У некаторых лакальных варыянтах абраду «капачы» дапамагалі на памінальнай вячэры (падносілі стравы), а таму садзіліся за стол у апошнюю чаргу (в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна) [183, с. 386]. На Лепельшчыне «на кут» было прынята саджаць самага старэйшага жыхара вёскі [53, с. 223].

Лакальныя адрозненні ў пахавальным абрадзе іншы раз тычыліся асартыменту страў на памінальным застоллі. У в. Залеснае Глыбоцкага раёна існуе патрабаванне ў посным жалобным стале [43, арк. 19]. У в. Юхнаўка Докшыцкага раёна існаваў парадак, згодна з якім на памінальнай вячэры спачатку елі поснае, а потым пераварочвалі абрус і падавалі скаромнае [54, р. 129]. Для Падзвіння найбольш характэрнымі з'яўляюцца тры памінальныя стравы: куцця, поліўка (юшка) і клёцкі. Гэта тычыцца памінальнай вячэры ў дзень пахавання і каляндарных памінак [55, с. 40]. Дадзеныя памінальныя стравы характэрны для Барысаўскага і Лагойскага раёнаў Мінскай вобласці, у той час як у другіх раёнах Мінскай вобласці распаўсюджаны іншыя наборы рытуальных страў [40, с. 323; 56, л. 322]. У дадзеным элеменце пахавальна-памінальнай абраднасці прасочваецца тыпалагічнае падабенства і нават роднасць традыцыйнай культуры Барысаўскага і Лагойскага раёнаў з падзвінскім рэгіёнам.

Акрамя памінальнай трапезы ў хаце, на тэрыторыі Падзвіння спарадычна фіксуецца традыцыя частаваць усіх прысутных на могілках адразу пасля пахавання. Гэты абрадавы акт не залежаў ад часу правядзення памінальнай трапезы ў хаце. Але ім абумоўлены некаторыя асаблівасці. Так, на Лепельшчыне, існавала традыцыя частаваць пасля пахавання гарэлкай, пасля чаго ўсе адпраўляліся на памінальную вячэру ў хату памерлага [32, с. 52]. У апісаннях, дзе памінальная вячэра адбывалася да пахавання, характэрнай асаблівасцю частавання на могілках з'яўлялася «паднашэнне» ўсім прысутным куцці [11, с. 209; 36, с. 89]. Старажытная мадэль пахавальнага рытуалу, часткай якой быў абавязковы падзел куцці (як

сімвал калектыўнай долі) менавіта пасля пахавання памерлага, захоўвалася нават у выпадку, калі памінальнае застолле ў хаце ладзілася яшчэ перад вынасам цела.

Традыцыя частаваць на могілках прысутных захоўваецца і ў сучасны перыяд. Рытуальныя дзеянні на дадзеным этапе абраду ў розных мясцовасцях маюць сваю спецыфіку. Яна праяўляецца нават у межах невялікіх тэрыторый [22, с. 318].

Неад’емным кампанентам пахавальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з’яўляюцца галашэнні, якія ўваходзяць амаль ва ўсе яе структурныя часткі. Галашэнні выконваліся на працягу ўсяго пахавальнага абраду: пры абмыванні і апрананні нябожчыка, пераносе яго ў труну, наведванні хаты памерлага роднымі і суседзямі, развітанні з ім у хаце і вынасу труны, у час дарогі на могілкі, пры развітанні з памерлым на могілках і на памінальнай вячэры [57, с. 62; 58, с. 42; 59, с. 3]. Галашэнні былі своеасаблівым спосабам апавяшчэння суседзяў аб смерці [18, с. 379]. Галасілі па памерламу пераважна жанчыны [60, с. 85; 61, с. 61; 62, s. 93]. На Падзвінні лічылася непавагай да нябожчыка і яго родных, калі жанчына, знаёмая ці сваячка, прыйшоўшы ў дом, не прагалосіць над нябожчыкам [21, с. 525]. У заходняй і цэнтральнай частках рэгіёна сярод беларускага насельніцтва захаваліся ўспаміны, што ў мінулым для гэтых мэт на пахаванне нават запрашалі спецыяльных «плакальшчыц» [48, арк. 43; 21, с. 382].

У межах Падзвіння існуюць лакальныя адрозненні, якія тычацца пахавальных галашэнняў. У плачах-галашэннях паўночных раёнаў Падзвіння выяўлена наяўнасць рэгістравага кантрасту, дзе «галасільшчыца прыгаворваіць» у высокім рэгістры («тонкім, жалосным голасам»), пасля чаго голас «падае» ніжэй на субкварту – на сексту, сепціму, актаву, ноту [63, с. 23]. У залежнасці ад комплексу структурна-рытмічных і ладава-меладычных кампанентаў на Падзвінні распаўсюджаны тры тыпы напеваў. Першы з іх бытуе на паўночным усходзе Віцебскай вобласці (Расонскі, усходняя частка Полацкага, Гарадоцкі, Віцебскі, Лёзненскі, Шумілінскі раёны). Арэал другога тыпу ўключае Браслаўскі, Вехнядзвінскі, заходнюю частку Полацкага, Лепельскі, Чашніцкі, Сенненскі і Талачынскі раёны Віцебскай вобласці. Трэці тып распаўсюджаны ў Шаркаўшчынскім, Глыбоцкім, Докшыцкім, Пастаўскім раёнах Віцебскай вобласці, Вілейскім раёне Мінскай вобласці. Акрамя таго, ў Докшыцкім раёне зафіксавана спецыфічная ўнутрытыпавая разнавіднасць напеваў пахавальных галашэнняў [61, с. 69–70; 57, с. 85–91].

У рэгіёне зафіксаваны таксама розныя назвы саміх галашэнняў. Галашэнні па нябожчыку ў Полацкім павеце называліся *«голасам»*, а ў Веліжскім – *«выцьцём»*; у пераносным сэнсе яны мелі назву *«кукуваньня»* (Віцебскі павет) [64, с. 222].

**Вывады.** Аналіз этнаграфічных матэрыялаў другой паловы XIX – пачатку XXI ст. дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1. Традыцыйны пахавальны абрад беларусаў Падзвіння з’яўляецца часткай пахавальнай абраднасці беларускага этнасу. У сваёй аснове ён мае тыя ж кампаненты, што і абраднасць іншых рэгіёнаў краіны, але пры гэтым праяўляе рэгіянальныя асаблівасці. Яны прасочваюцца як па канкрэтных элементах абраднасці, так і іх групах; уласцівы як духоўнай частцы абраднасці, так і матэрыяльным яе кампанентам (рытуальныя стравы, могілкавыя атрыбуты і інш.). Рэгіянальныя асаблівасці ўтварыліся ў выніку ўздзеяння спецыфічных культурных, грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных фактараў. Рэгіянальная адметнасць дадзенай часткі культуры беларусаў з’яўляецца складанай часткай этнакультурнай спецыфікі ўсяго падзвінскага рэгіёна.

2. У межах гістарычна-этнаграфічнага рэгіёна Падзвінне пахавальная абраднасць беларускага этнасу мае лакальныя варыянты. Аналіз яе зместу і структуры дазваляе сцвярджаць аб існаванні значнай лакальнай варыятыўнасці ва ўсіх частках і элементах абрадавага комплексу. Яна характэрна асобным абрадавым дзеянням, іх семантыцы, уяўленням і прадпісанням, матэрыяльнай абрадавай атрыбутыцы, а таксама праяўляюцца ў наяўнасці ці адсутнасці ў канкрэтным рэгіёне пэўных структурных частак абраду. Нягледзячы на мадэрнізацыю і ўніфікацыйныя тэндэнцыі ў культуры беларусаў у XX – пачатку XXI ст., пахавальная абраднасць беларускага насельніцтва Падзвіння ў наш час яшчэ працягвае захоўваць лакальную разнастайнасць. Аднак у выніку вышэй адзначаных працэсаў многія лакальныя варыянты дадзенай часткі культуры зніклі, а шэраг з іх захоўваецца толькі ў пасіўнай форме (у памяці рэспандэнтаў).

ЛІТАРАТУРА

1. Седакова, О.А. Поэтика обряда : Погребальная обрядность восточных и южных славян / О.А. Седакова. – М. : Индрик, 2004. – 320 с.

2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў вёскі Свіркі і Валодзькі Докшыцкага раёна (2012 г.). Запісы Матошка А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 7.

3. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре : Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 237 с.

4. Легенды і паданні / склад. : М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі ; рэд. тома А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

5. Зеленин, Д.К. Избранные труды. Очерки русской мифологии : Умершие неестественной смертью и русалки / Д.К. Зеленин ; вступ. ст. Н.И. Толстого ; подг. текста, комент., указат. Е.Е. Левкиевской. – М. : Индрик, 1995. – 432 с.
6. Лобач, У. Самагубца / У. Лобач // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 424–425.
7. Аўсейчык, У.Я. Эвалюцыя пахавання «нячыстых» нябожчыкаў у ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя (па матэрыялах беларусаў Падзвіння) / У.Я. Аўсейчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2011. – Вып. 11. – С. 317–323.
8. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], Х, 307, 30 с.
9. Сысоў, У.М. Беларуская пахавальная абраднасць : Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння / У.М. Сысоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.
10. Шпілеўскі, П.М. Беларусь у абрадах і казках / П.М. Шпілеўскі ; пер. з рус. А. Вашчанкі. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. – 301 с.
11. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
12. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 4.
13. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 5.
14. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 7. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі у в. Гайдукі Пастаўскага раёна (2008–2009 гг.). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 8.
15. Толстой, Н.И. Глаза и зрение покойников в славянских народных представлениях / Н.И. Толстой // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд : тезисы докладов / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР ; редкол. : Вяч.Вс. Иванов (отв. ред.), Л.Г. Невская. – М., 1985. – С. 83–87.
16. Расонска-Віцебская экспедыцыя (чэрвень, 1989).– Сш. 2. Запісы Сысова У.М. // АІМЭФ. – Ф. 8. Воп. 89. Спр. 244.
17. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 4. Запісы Аўсейчыка У.Я., Круткіна А., Шумілава Дз., Жахоўскага Б., Салаўёва С., Путронка К., Пятрова І., Трацяковай А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3.
18. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – 910 с.
19. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3.
20. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А., Трацяковай А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3.
21. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1. Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.
22. Крук, І.І. Народныя абрады і звычаі Верхнядзвіншчыны / І.І. Крук // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Верхнядзвінскага раёна : у 2 кн. – Мінск, 2000. – Кн. 2. – С. 292–319.
23. Аўсейчык, У.Я. Полаўзроставыя асаблівасці ў традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння / У.Я. Аўсейчык // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : сб. материалов четвертой междунар. науч. конф., Полоцк, 28–29 окт. 2010 г. / Полоцк. гос. ун-т ; редкол. : М.Д. Путрова [и др.]. – Новополоцк, 2010. – С. 93–97.
24. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Лобача У.А., Зянько В., Шаўчэнка Я. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2.
25. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я., Лобача У.А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 5.
26. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 8. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Мёрскі і Верхнядзвінскі раёны (16–17 чэрвеня 2009 г.). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 8.
27. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 9. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі ў вв. Лоўжа і Пабеда Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці (2009 г.). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 8.
28. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны (ліпень 1996 г.). – Сш. 2. Запісы студэнтаў групы 95-Гіс Гаўрылава В., Далгова Д., Сакалова Ю., Яронька В., Зубровай А., Муляронак Н., Кірычык В., Вярцінскай А., Зайцавай А., Змітрачэнка А., Рублеўскай В. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2.
29. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А., Трацяковай А., Пятрова І. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3.
30. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак : у 5 т. / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. Ю.Ф. Мацкевіча. – Мінск : Фонд фундам. дасл. Рэсп. Беларусь, М-ва архітэктуры і буд-ва Рэсп. Беларусь, 1996. – Т. 3 : Чалавек / уклад. : А.П. Груцо [і інш.] ; навук. рэд. І.Я. Яшкін. – 115, [293] с.
31. Листова, Т.А. Семейные обряды русско-белорусского пограничья в контексте этнополитической истории. XIX – начало XXI вв. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / Т.А. Листова. – М., 2006. – 349, [20] л.

32. Пщелко, А.Р. Микитовы хаутуры. Очерк из белорусской жизни / А.Р. Пщелко. – Витебск : Типо-Литограф. П.А. Подземского, 1910. – 53 с.
33. Троицкий, А. Уклад – спеваки и шептуны разорители / А. Троицкий // Литов. епарх. ведомости. – 1875. – 23 февр. – С. 69–70.
34. Расонска-Віцебская экспедыцыя (чэрвень, 1989).– Сш. 3. Запісы Сысова У.М. // АІМЭФ. – Ф. 8. Воп. 89. Спр. 244.
35. Полацкі этнаграфічны зборнік / Полац. дзярж. ун-т ; [уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача]. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння, ч. 2. – 368 с.
36. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб., 1865. – С. 75–90.
37. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер'і / укл., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.
38. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка [і інш.]. – 797 с.
39. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе / В.І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай : у 2 кн. – Кн.1. – 559 с.
40. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2010. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь / В.І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай : у 2 кн. – Кн.1. – 847 с.
41. Шейн, П.В. Белорусские народные песни / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.
42. Аб'екты сакральнай тапаграфіі ў сістэме духоўнай культуры беларусаў Полацкага Падзвіння XX – пачатку XXI стагоддзя : справаздача аб НДК / Полацк. дзярж. ун-т ; кіраўн. У.А. Лобач. – Наваполацк. – 135 с. – ГР 20091311.
43. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі раён (ліпень 2001 г.). – Сш. 1. Запісы студэнтаў групы 2000-Гіс Сясіцкага У., Хартовай М., Волкава А., Раманенка В., Гвоздзевай А. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 1.
44. Драбудзька, Н.В. Тэксты з гаворкі Кашталянаўшчына Глыбоцкага раёна / Н.В. Драбудзька // Жывое наша слова : дыялектал. зб. : (да 90-годдзя чл.-кар. НАН Беларусі Ю.Ф. Мацкевіч) / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; рэд. Л.П. Кунцэвіч, І.Я. Яшкін. – Мінск, 2001. – С. 280–289.
45. Валодзіна, Т. Смецце / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 451.
46. Троицкий, А. Уклад / А. Троицкий // Литов. епарх. ведомости. – 1875. – 16 мар. – С. 95–96.
47. Sielicki, F. Kryż w werzeniach ludu Wilejszczyzny / F. Sielicki // Slavia Orientalis. – 1989. – T. 38, № 3–4. – S. 447–451.
48. Матэрыялы апытання па тэме : «Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння» (2012–2013 гг.). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 11.
49. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 4. Запісы Аўсейчыка У.Я., Круткіна А., Шумілава Дз., Жахоўскага Б., Салаўёва С., Путронка К., Пятрова І., Трацціяковай А. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 3.
50. Дучиц, Л.В. Памятники X–XIII вв. в бассейне Западной Двины (зона затопления Даугавпилской ГЭС). Свод древних каменных крестов на территории Белоруссии / Л.В. Дучиц // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. Спр. 2233.
51. Дучиц, Л.В. Роль камня в погребальном обряде / Л.В. Дучиц // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. Спр. 2230.
52. Раманюк, М. Беларускія народныя крыжы / М. Раманюк. – Вільня : Наша Ніва, 2000. – 221 с.
53. Пшонка, Т.М. Асаблівасці выкарыстоўвання традыцыйнай ежы ў святах народнага календара Лепельшчыны / Т.М. Пшонка // Народная культура Віцебшчыны : матэрыялы навук.-практ. канф. «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», Віцебск, 26–27 мая 2005 г. : [прысвяч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага] / рэдкал. : Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск, 2007. – С. 219–224.
54. Lietuvių literatūros ir tautosakos instituto Lieuvių tautosakos rankraštynas. – 7647. Tautosaka 2006 m. liepos mėnesį prie Neris ištakų surinkta Lietuvos ir Baltarusijos mokslininkų grupės, vadovaujamos Vykinto Vaitkevičiaus.
55. Аўсейчык, У.Я. Восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння : рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты / У.Я. Аўсейчык // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. – 2012. – №9. – С. 35–44.
56. Дулебо, А.И. Современный общественный и семейный быт белорусских колхозников : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / А.И. Дулебо. – Минск, 1966. – 367 л.
57. Варфаламеева, Т.Б. Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння / Т.Б. Варфаламеева // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча ; артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск, 1986. – С. 60–96.
58. Васілевіч, У.А. Беларускія жалобныя абрады і галашэнні / У.А. Васілевіч // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча ; артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск, 1986. – С. 5–59.
59. Невская, Л.Г. Балто-славянское причитание : Реконструкции семантической структуры / Л.Г. Невская. – М. : Наука, 1993. – 240 с.
60. Байбурин, А.К. Похороны и свадьба / А.К. Байбурин, Г.А. Левинтон // Исследования в области балто-славянской духовной культуры. Погребальный обряд. – М., 1990. – С. 64–99.

61. Варфаламеева, Т. Сямейна-абрадавы цыкл / Т. Варфаламеева // Беларусы / Т.Б. Варфаламеева [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Т. 11 : Музыка. – С. 41–88.
62. Sielicki, F. Pieśni pogrzebowe i dziadowskie śpiewane w b. powiecie Wilejskim / F. Sielicki // Acta Universitatis Wratislaviensis. Slavica Wratislaviensia. – Warszawa–Wrocław, 1982. – T. 22. – S. 91–104.
63. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.
64. Шлюбскі, А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны : у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.

*Пастуніў 17.05.2017*

## TRADITIONAL FUNERAL RITES OF THE BELARUSIANS OF DVINA REGION: REGIONAL PARTICULARITIES AND LOCAL VARIATIONS

***U. AUSEICHYK***

*Traditional funeral rites of the Belarusians of Dvina Region are considered on the basic of the ethnographic materials of the second half of the 19th – the beginning of the 21st centuries. The regional particularities and local variations are determined. We make a conclusion that the traditional funeral rites of the Belarusians of Dvina Region have the same elements in their foundation as the rites of other Belarusian regions, however they show regional particularities. Within the boundaries the funeral rites of the Belarusian ethnos has local variations. It is individual for certain ritual actions, their semantics, conceptions and regulations, material ritual attributes, they come out in availability or absence of some structural ritual parts in the concrete region. New materials – most part of them was committed by the author in the boundaries of the region – were involved into ethnologic studies.*

***Keywords**: traditional funeral rites, the Dvina region, Belarusian ethnos.*